# Пасябруюць з мовай

**Шанц вывучыць родную мову дасць беларусам Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я. Ф. Карскага.**

Гэта першыя курсы беларускай мовы ў нашым горадзе. Як расказала Елена Кучынская – бібліятэкар першай катэгорыі, яны будуць накіраваны ў асноўным на вывучэнне новых правілаў арфаграфіі і пунктуацыі. Заняткі плануецца праводзіць два разы на тыдзень. Працягнуцца яны чатыры месяцы. За гэты час выкладчыкі вну навучаць слухачоў дасканала пісаць і размаўляць на беларускай мове. Курсы пачнуцца з 1 лістапада і будуць праходзіць у галоўным будынку Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Ф. Карскага.

**Маргарыта ГАМІНА.**